Галіна Суша

член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, супрацоўнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Рэгіянальныя традыцыі Лепельшчыны: сучасны стан, захаванне і адраджэнне народных строяў

Традыцыйны касцюм з'яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў, якія вызначаюць культурную прастору Беларусі. У ім увасобіліся эстэтычныя ўяўленні, этычныя погляды, вераванні беларускага народа. Касцюм — гэта адна з самых устойлівых з'яў традыцыйнай культуры, якая служыць неабходным атрыбутам пры вывучэнні этнічнай гісторыі народа, яго абрадаў і звычаяў. Як сінкрэтычны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва касцюм дае ўяўленне аб шматлікіх традыцыйных рамёствах беларусаў: ткацтве, пляценні, ювелірным мастацтве, апрацоўцы скуры і інш.



З'яўляючыся этнавызначальнай прыметай для ўсёй Беларусі, касцюм у розных рэгіёнах краіны мае вызначаныя асаблівасці, якія ствараюць непаўторныя каларыты. Гэта архаічнасць і чысціня ліній на Заходнім Палессі, маляўнічасць на Усходнім Палессі, гарманічная ўраўнаважанасць у Цэнтральнай Беларусі, манументальнасць у Падзвінні, дынамічны сілуэт у Панямонні, незвычайная разнастайнасць і багацце дэкору ў Падняпроўі.

Буйныя гісторыка-этнаграфічныя вобласці Беларусі ў сваю чаргу маюць зоны лакальных асаблівасцей традыцыйнага касцюма ў тэхніцы выканання, у спосабе нашэння дэталей вопраткі, у характары арнаменту і інш. Такія лакальныя разнавіднасці касцюма вызначаюцца тэрмінам «строй». У Беларусі налічваецца больш за 30 строяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйнае адзенне ў большай ступені адлюстроўвае нацыянальную спецыфіку беларусаў, чым іншыя формы побыту. Асаблівая роля ў каларыстыцы адзення адводзіцца серабрыста-беламу колеру натуральнага лёну або воўны, які ўвасабляе свята і радасць. Акрамя белага, важнае месца займае чырвоны колер, які сімвалізуе жыццё, а аб'яднаны ў складаную сістэму знакаў — арнаментаў, нанесеных на адзенне ў час вышыўкі або ткацтва, — служыць засцерагальным знакам.

Беларускае народнае адзенне аднатыпнае на ўсёй тэрыторыі краіны, але ў ім вылучаюць чатыры асноўныя камплекты ў залежнасці ад таго, з чым насілі кашулю ў жаночым строі: са спадніцай і фартухом; са спадніцай, фартухом і гарсэтам; са спадніцай, да якой прышыты ліфгарсэт, і фартухом; з панёвай, фартухом і гарсэтам. Першыя два вядомыя — усюды, два другія — ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі. Кожны з іх па-свойму адлюстроўвае эвалюцыю строю. У кожным з іх адбіліся і асаблівасці такіх этнаграфічных рэгіёнаў, як Заходняе і Усходняе Палессе, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне і Паазер'е.



У параўнанні з іншымі рэгіёнамі Паазер'е ці Наддзвінне найменш захавала старадаўнія і традыцыйныя формы адзення. З прычыны геаграфічных і сацыяльна-эканамічных фактараў тут у сярэдзіне XX ст. распаўсюдзіўся касцюм накшталт гарадскога, а ў вырабе тканін — ручная набойка. Менавіта набойка істотна паўплывала на вобразнапластычны і арнаментальна-каларыстычны лад касцюма. У строях назіраецца ўлюбёнасць у блакітны колер і дробнаклятчасты ўзор у паясным адзенні. Асноўным з'яўляўся камплект з прышыўным ліфам, а ў асобных раёнах — сарафан. Абавязковым кампанентам жаночага адзення быў фартух.

Найбольш даследаванымі і захаванымі на Паазер'і з'яўляюцца Дубровенскі і Лепельскі строі.

Дубровенскі строй мае старадаўні (са спадніцай, ільняным фартухом і куртай — безрукаўкай з сукна, пакрытага белым каленкорам) і больш позні (са спадніцай, прышыўным ліфам і поясам) камплекты. Чырвонабардовы колер вышывак часта дапаўняецца бардовым і жоўтым.

Лепельскі строй характарызуецца спалучэннямі белага, блакітнага, вохрыста-жоўтага і чорнага колераў у аднатонных ці пярэстатканых спадніцах, лагічнай кампазіцыяй дэкору і яснай архітэктонікай.

Можна сказаць, што Паазер'е ці Віцебшчына і на сённяшні дзень з'яўляецца рэгіёнам, дзе традыцыйны строй беларусаў мала даследаваны. Яшчэ гадоў трыццаць таму Віцебская вобласць лічылася ўвогуле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ледзь не пустым краем у галіне народнай культуры, таму што гэтыя мясціны раней чым іншыя закранула цывілізацыя. Яшчэ ў канцы XIX ст. там перасталі насіць народнае адзенне. Другая Сусветная вайна моцна разбурыла гэты рэгіён і знішчыла амаль палову насельніцтва. Але як толькі насталі новыя часы, на Віцебшчыне з'явіліся спецыялісты-энтузіясты, якія паставілі канкрэтную задачу — адрадзіць тое, што можна, і сёння Віцебская вобласць задае тон усёй Беларусі па адраджэнню традыцый.

У свой час вядомым беларускім этнографам М. Раманюком была выканана для Віцебскага абласнога краязнаўчага музея мастацка-графічная рэканструкцыя вясельных строяў маладога і маладой на Паазер'і. Дзякуючы гэтаму можна ўявіць, як выглядалі жаніх і нявеста на Лепельшчыне ў канцы XIX ст. Вобраз дзяўчыны прадстаўлены ў экспазіцыі ў традыцыйным касцюме сялянкі Веліжскага строю: прыгожая кашуля з фабрычнай баваўнянай тканіны — уплыў гарадской моды — з бурштынавымі караламі, яркі «вілачкавы» сарафан-спадніца з ліфам, «які пераходзіў у маленькую спінку і вузкія шлейкі», пояс з кутасамі, фартух з батысту і пакупных плеценых карункаў, пунсовая кашміровая хустка з малюнкамі кветак і яркая стужка ў ільняной касе. У пасаг звычайна ўваходзілі палотны, шарачок, сукно, ручнікі, посцілкі і, вядома ж, бялізна ды верхняя вопратка. У куфры — вышытая кашуля для жаніха, жаночая кашуля на какетцы, намітка, паясы, а таксама пасцельныя рэчы, абрусы, ручнікі — тое, што дзяўчына наткала для будучага жыцця.



Паводле матэрыялаў Лепельскага краязнаўчага музея і навуковых распрацовак М. Раманюка, у Лепельскім доме рамёстваў створана калекцыя нацыянальных касцюмаў беларусаў розных сацыяльных груп, гістарычных перыядаў і рэгіёнаў. Фондавая калекцыя ўжо складае 47 касцюмаў, якія выраблены спецыялістамі Дома рамёстваў. Калекцыя традыцыйных беларускіх строяў дэманстравалася Домам рамёстваў на міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях моды нацыянальнага адзення і адзначана спецыяльным прызам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «За зберажэнне традыцый у нацыянальным касцюме». Лепельскі дом рамёстваў — лаўрэат Другой Нацыянальнай выстаўкі народнай творчасці «Жывыя крыніцы».

На сённяшні дзень у Лепельскім Доме рамёстваў па захаванні нацыянальных культурных традыцый працуюць майстэрні па 12 кірунках дэкаратыўна-прыкладнога народнага мастацтва: ткацтва ручнікоў, посцілак, беларускіх паясоў, гафт, вышыўка, саломапляценне, габелен,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальная лялька, ганчарства, кераміка, выраб нацыянальных галаўных убораў і строяў і інш. Гурткі для дзяцей і дарослых працуюць па 5-і кірунках: кераміка, габелен, ткацтва паясоў, роспіс, ткацтва.

Кожная майстэрня Дома рамёстваў — гэта своеасаблівая лабараторыя: майстры не толькі навучаюць рамёствам, але і арганізуюць этнаграфічныя экспедыцыі, збіраюць фотаматэрыялы, праводзяць персанальныя выстаўкі. Такім чынам, пасля этнаграфічных экспедыцый па раёне адноўлены мужчынскі і жаночы касцюмы Лепельскага строю, вясельныя ўборы маладых, ручнікі, ходнікі, вырабы керамікі. Калекцыя Дома рамёстваў папаўняецца новымі экспанатамі: узорамі ткацтва, гафту, ганчарства, вязання.

У сваёй працы метадысты-майстры таксама кіруюцца навуковымі распрацоўкамі, вынікамі экспедыцыйных даследаванняў вядучых этнографаў Беларусі. Пасля апрацоўкі матэрыялы выкарыстоўваюцца ў навучанні. У Доме рамёстваў заўсёды могуць атрымаць кваліфікаваную кансультацыю і настаўнікі пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрокаў народнай культуры, і выхавацелі дзіцячых садоў, і працаўнікі культуры пры падрыхтоўцы народных свят у вёсцы.



Шмат гадоў народных майстроў горада і раёна аб’ядноўвае клуб «Скарбонка», які працуе пры Доме рамёстваў, дзе вядзецца актыўная дзейнасць па захаванню, вывучэнню і папулярызацыі традыцый народных мастацкіх промыслаў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

На базе сярэдніх школ г. Лепеля ўжо некалькі гадоў запар праводзяцца ўрокі па лепцы з гліны, саломапляценню, гафту. Такія ж заняткі праводзяцца ў дзіцячых садках. За гады існавання ў Доме рамёстваў займалася дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам больш за 2 тыс. чалавек, большасць з якіх — дзеці. Многія з тых, хто займаўся ў Лепельскім Доме рамёстваў, сталі сапраўднымі майстрамі, паступілі на дэкаратыўна-прыкладныя аддзяленні ВНУ Мінска і Віцебска. Але самае галоўнае тое, што супрацоўнікам Лепельскага Дома рамёстваў удалося прывіць цікавасць, паказаць, што галоўная задача — гэта не проста «рэстаўрацыя» забытага рамяства, а жывая справа, у якой ёсць будучыня. У майстэрнях ідзе не толькі навучанне і перадача падрастаючаму пакаленню тэхналогій і мастацкіх асаблівасцей народных рамёстваў, але і стварэнне новых мастацкіх каштоўнасцей. Пацверджанне таму — шматлікія дыпломы, узнагароды майстроў па выніках фестываляў і конкурсаў: на Другім Усебеларускім фестывалі народнага мастацтва «Беларусь — мая песня» атрыманы дыплом лаўрэата Другой Нацыянальнай выстаўкі народнай творчасці «Жывыя крыніцы»; дыплом Рэспубліканскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фестывалю-конкурсу рамёстваў «Вясновы букет»; дыплом (I месца) абласнога конкурсу вышыўкі «Чароўная нітка», дыплом Трэцяй Нацыянальнай выстаўкі інсітнага мастацтва. Лепельскі Дом рамёстваў стаў прызёрам Рэспубліканскай выстаўкі-кірмашу рамёстваў «Горад майстроў» і па выніках працы занесены на абласную Дошку гонару.

Навучыцца рамяству ў Доме рамёстваў можна не толькі наведваючы гурткі. Папулярнасцю карыстаюцца лекцыі-кансультацыі па розных відах рамёстваў, майстар-класы. На заняткі дзеці прыходзяць цэлымі класамі. А для дарослых майстар-класы праводзяцца ў больш складанай форме. Задача ў такой форме працы больш высакародная — адрадзіць на Лепельшчыне традыцыі старажытных промыслаў, прыцягнуць да іх як мага больш людзей і, значыць, абудзіць у іх пачуццё нацыянальнага гонару. З гэтай жа мэтай Домам рамёстваў перыядычна, раз у два гады, ладзіцца рэгіянальны конкурс ткацтва «Матчыны кросны». У 2011 г. конкурс праводзіўся ўжо пяты раз і традыцыйна сабраў майстрых з усёй Віцебскай вобласці. Цешыць той факт, што лепяльчане традыцыйна займаюць у конкурсе прызавыя месцы. А ў 2011 г. дыпломамі I ступені ўзнагароджаны вучаніцы майстроў у намінацыях «Ткацтва пояса» і «Творчы дэбют».



Наяўнасць вучняў, якія працягваюць рамесныя традыцыі, стала асноўным пытаннем своеасаблівага экзамену, які ў 2011 г. здавалі вядомыя старэйшыя майстры Лепельскага Дома рамёстваў Ніна Кудзіна і Наталля Петухова Рэспубліканскай камісіі па наданню ганаровага звання — народны майстар Беларусі. Выпрабаванні былі вытрыманы бліскуча — ім прысуджана ганаровае званне «народны майстар Беларусі».

З 2005 г. Домам рамёстваў вядзецца актыўная праца па вывучэнню традыцыйнага строю рэгіёна. Праца гэта калектыўная, бо патрабуе пэўнага ведання тэхнік ткацтва, вышыўкі, пляцення, вырабу традыцыйнага галаўнога ўбору, а таксама асаблівасцей крою. Вынікам стала створаная навукоўцамі калекцыя нацыянальных строяў беларусаў розных сацыяльных груп, гістарычных перыядаў і рэгіёнаў «Белая Русь», якая ўключае 47 строяў беларусаў розных саслоўяў і рэгіёнаў, калекцыя стылізаванага адзення «Тканае адзенне».

Супрацоўнікамі Дома рамёстваў створаны фальклорныя, аўтэнтычныя, сцэнічныя камплекты адзення як для прафесійных калектываў (ДУ БДА «Песняры», Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей (строі для дыяспары літоўцаў), так і самадзейных калектываў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шматлікіх раёнаў Віцебскай вобласці («Палата», «Знічка» Полацкага р-на, «Крыніца» Расонскага р-на, калектываў ДШМ Докшыцкага р-на, і інш.). Актыўна вядзецца праца па прапагандзе народнай творчасці шляхам шырокай выставачнай дзейнасці. Штогод у сярэднім праводзіцца каля 30-і выставак ДПМ рознага ўзроўню. Бярэ ўдзел Дом рамёстваў у выстаўках рэспубліканскага, міжнароднага ўзроўню (фестываль «Славянскі базар», конкурс-кірмаш «Вясновы букет», Рэспубліканскае свята «Дажынкі» і інш.).

Аб тым, што межы дзейнасці Лепельскага Дома рамёстваў па адраджэнню народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўвесь час пашыраюцца, сведчыць хаця б такі факт: адкрыты яго філіялы ў аграгарадку Старое Лядна і ў в. Стаі, а таксама Дом ткацтва ў Домжарыцах.

Падтрымка майстроў, прапаганда іх творчасці ажыццяўляецца праз работу мастацкага салона-магазіна «Скарбонка», які створаны ў адпаведнасці з рашэннем Лепельскага райвыканкама ў 1996 г. Аднак з рэалізацыяй вырабаў майстроў шмат клопату. Супрацоўнікі Дома рамёстваў разумеюць, што салон-магазін дае шырокія магчымасці не толькі для таго, каб ладзіць выставачную дзейнасць і праводзіць пасяджэнні клуба майстроў, але і для рэкламы дзейнасці самога Дома рамёстваў перад шматлікімі гасцямі Віцебшчыны. Наведванне салона-магазіна і Дома рамёстваў уключана ў гарадскі турыстычны маршрут.



Тэма зберажэння і адраджэння народных традыцый уплывае і на асветніцкую, навукова-метадычную, камерцыйную дзейнасць. Менавіта камерцыйную функцыю Дома рамёстваў выконвае майстэрня-лабараторыя па вырабе народных касцюмаў. Работа гэтай майстэрні — асноўная крыніца пазабюджэтнай дзейнасці Лепельскага Дома рамёстваў.

Хацелася б, каб праца работнікаў дамоў рамёстваў, гэтых сапраўдных энтузіястаў і выдатных, таленавітых людзей, годна ацэньвалася. Тады мы зможам зберагчы ўнікальныя кадры для нацыянальнай культуры. Але, на жаль, сярэдні заробак метадыста-майстра па рамёствах невысокі. Аднак менавіта яны, майстры і настаўнікі моладзі, з’яўляюцца прадаўжальнікамі і захавальнікамі найкаштоўнейшага скарбу — традыцыйнага мастацтва беларусаў.

Той, хто хоць аднойчы дакрануўся да традыцыі, не можа застацца абыякавым, традыцыя ўваходзіць у жыццё гэтага чалавека. Традыцыйнае аддзенне — не проста надзвычай камфортнае, унікальнае, прыгожае, зручнае, эксклюзіўнае, але і актуальнае. Асаблівасць беларускага строю ў тым, што яго канструкцыя такая дасканалая, у ім няма нічога лішняга, а ўсе элементы настолькі матываваныя, што можна апранаць і сёння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насіць, а калі — паасобку, то ніхто не здагадаецца, што гэта насілі сто гадоў таму. Але строй быў і застаецца невычэрпнай крыніцай натхнення, матываў і вобразаў для сучасных прафесійных творцаў, выдатным помнікам народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

*Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка ; [маст. Э. Э. Жакевіч]. — Мінск : Ураджай, 2001.
2. *Бялявіна, В. М., Ракава, Л. В.* Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007.
3. *Бялявіна, В. М., Ракава, Л. В.* Мужчынскі касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007.
4. *Кацар, М. С.* Беларускі арнамент : Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. — Мінск, 1996.
5. *Маленко, Л. И.* Белорусский костюм XIX — XX вв. / Л. И. Маленко. — Минск : Белорусская наука, 2005.
6. *Романюк, М. Ф.* Белорусская народная одежда / М. Ф. Романюк. — Минск, 1981. — 473 с. : илл.
7. *Фадзеева, В.* Беларуская народная вышыўка / В. Фадзеева. — Мінск, 1991.
8. Беларускае народнае адзенне. — Мінск : Навука і тэхніка, 1975.
9. Гістарычнае і народнае адзенне Віцебшчыны // Матэрыялы навук.-практ. канф. — Віцебск, 1992.
10. *Віннікава, М. М.* Жаночыя галаўныя ўборы ў традыцыйным адзенні Заходняга Палесся / М. М. Віннікава // Загароддзе-2. — Мінск, 2000. С. 90—99.
11. *Лобачевская, О. А.* Декоративно-конструктивные швы в белорусском народном костюме : семантика, орнаментика, технология / О. А. Лобачевская; Мода и дизайн : исторический опыт — новые технологии // Материалы 6-й междунар. науч. конф. ; под ред. Н. М. Калашниковой. — СПб. : СПГУТД, 2003. — С. 74—79.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ